chrichten aus Palessje, Besuch von Bürgermeister Ritz.jpg



БУДНІ ЎЛАДЫ

# Сяброўства без межаў

**На гэтым тыдні з візітам у горад Столін прыбыў бургамістр горада-пабраціма Хомберг (Германія) Ніка Рыц.**

У Столінскім райвыканкаме адбылася сустрэча бургамістра з кіраўніком раёна Рыгорам Пратасавіцкім. Як сказаў Ніка Рыц, ён упершыню прыехаў у Беларусь. І першыя ўражанні ад краіны і горада толькі станоўчыя.

– Сяброўства паміж нашымі гарадамі надта каштоўнае, – адзначыў бургамістр. – У наступным годзе будзе ўжо чвэрць стагоддзя, як усталяваліся такія адносіны.

Удзельнікі сустрэчы абмяняліся думкамі накот аздараўлення нашых дзяцей у Германіі, а таксама абмеркавалі іншыя актуальныя пытанні.

Тэкст і фота Алены КЛІМУШКА

